# Крыніца ведаў і натхнення

## Мар'інагорскі навучальна-педагагічны комплекс дзіцячы сад — сярэдняя школа ў лістападзе адзначыць 85-гадовы юбілей!

Гэта першая сярэдняя школа ў горадзе Мар'іна Горка. Гэта першая, а цяпер і адзіная гарадская беларускамоўная ўстанова адукацыі. І першая сярод гарадскіх школ, дзе з'явіліся групы дзіцячага садка і створаны спецыяльныя ўмовы для навучання і выхавання дзяцей з асаблівасцямі развіцця. Гэта сапраўдны адукацыйны комплекс, які вырашае шмат розных задач.

**Вадзім Анатольевіч КУШНЯРОЎ,**
дырэктар ДУА «Мар'інагорскі навучальна-педагагічны комплекс дзіцячы сад — сярэдняя школа»



Што значыць школа ў жыцці кожнага чалавека? Школа — гэта цэлы свет. Тут дзяцінства і вопыт аб'яднаны аднымі думкамі, аднымі марамі, аднымі мэтамі. Тут усе гарманічна дапаўняюць адно аднаго і разам імкнуцца да агульнага поспеху. Сюды ідуць вучыцца дзеці, і менавіта дзякуючы ім дарослыя застаюцца маладымі, крэатыўнымі, здольнымі вучыцца на працягу ўсяго жыцця. Школа — гэта крыніца ведаў для дзяцей і крыніца натхнення для дарослых.

Гісторыя Мар'інагорскага навучальна-педагагічнага комплексу дзіцячы сад — сярэдняя школа цікавая і не зусім звычайная. У нашым горадзе мы вядомы як школа № 1. Але як атрымалася так, што школа № 2 ужо адзначыла стагадовы юбілей, а мы толькі на падыходзе да гэтай прыгожай даты? Пра гэтую загадку і іншыя цікавосткі ў нашай гісторыі — па парадку.

У лістападзе 1937 г. у Мар'інай Горцы адкрылася беларуская школа. Чаму яна стала пад нумарам адзін, а не тая, якая ўжо згадвалася? Справа ў тым, што з 1915 г. у Мар'інай Горцы працавала школа, якая спачатку называлася земскай аднакамплектнай, пазней яна была перайменаваная ў чыгуначную сямігодку. А тая школа, што з'явілася 85 гадоў таму, якраз адпавядала ўсім патрабаванням аддзела народнай асветы, таму і адлік школ у нашым горадзе пачынаецца менавіта з яе. На працягу ўсяго існавання нашай установы тут працуюць і вучаць так, каб ні ў вучняў, ні ў іх бацькоў, ні ў настаўнікаў не заставалася сумненняў, што першая школа павінна заўсёды быць у ліку першых!

У 1937 г. школа размясцілася ў двухпавярховым цагляным будынку на вуліцы Калініна. Яна мела дзесяць вучэбных кабінетаў. Першым дырэктарам

ЧИТАЙТЕ В СВЕЖЕМ НОМЕРЕ «ОМ»